нений и дополнений является прежде всего укрепление белорусской государственности. Они направлены на сохранение способности государства самостоятельно и независимо от других государств, осуществлять свои функции, как на своей территории, так и за пределами. Они важны для обеспечения соблюдения прав и свобод граждан, а также для укрепления демократических институтов и правового порядка. Конституционное право Республики Беларусь относится к мобильным отраслям права, так как конституционно-правовое законодательство в условиях становления белорусской государственности более подвижно в сравнении с законодательством других отраслей права.

УДК 378.016: 811.161.3’276.6

***Т.Л. Памазенка,*** *старшы выкладчык кафедры беларускай і замежных моў Акадэміі МУС Рэспублікі Беларусь*

## ФАРМІРАВАННЕ ДАСЛЕДЧЫХ КАМПЕТЭНЦЫЙ КУРСАНТАЎ І СТУДЭНТАЎ У МЕЖАХ ВЫКЛАДАННЯ ДЫСЦЫПЛІНЫ “БЕЛАРУСКАЯ МОВА (ПРАФЕСІЙНАЯ ЛЕКСІКА)”

У сістэме падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў, якія адпавядаюць патрабаванням часу і здольны свабодна канкурыраваць ва ўмовах складанага, дынамічнага і зменлівага рынку працы, ляжыць кампетэнтнасны падыход як метадалагічная аснова сучаснага педагагічнага працэсу ў вышэйшай школе. Дадзены падыход вызначае новыя стандарты якасці адукацыі і рэалізуецца ў авалоданні будучым выпускніком па завяршэнні навучання наборам прафесійных кампетэнцый, неабходных для яго далейшай паспяховай жыццядзейнасці ў грамадстве. У іерархіі такіх кампетэнцый дамінантнымі варта прызнаць даследчыя, паколькі менавіта навукова-даследчая дзейнасць складае аснову як вучэбнай, так і будучай прафесійнай дзейнасці, выпрацоўвае ўменні асобы крытычна мысліць, прымаць самастойныя рашэнні ў сітуацыі выбару, прагназаваць магчымыя вынікі сваіх дзеянняў, вызначаць найбольш эфектыўныя спосабы супрацоўніцтва і інш. Даследчыя кампетэнцыі, па сваёй сутнасці, носяць метапрадметны характар, могуць фарміравацца ў межах выкладання цэлага шэрагу дысцыплін тэарэтычнага або прыкладнога цыкла, у тым ліку і вучэбнай дысцыпліны “Беларуская мова (прафесійная лексіка)”, змест якой у вышэйшых навучальных установах Рэспублікі Беларусь рэалізуецца на першай ступені атрымання вышэйшай адукацыі.

Увогуле даследчую кампетэнцыю можна трактаваць як здольнасць спецыяліста рэзультатыўна прымяняць атрыманыя веды, уменні,

навыкі ў ходзе навукова-даследчай дзейнасці і ў працэсе вырашэння прафесійных задач. Патэнцыял вучэбнай дысцыпліны “Беларуская мова (прафесійная лексіка)” дастаткова вялікі ў фарміраванні даследчых кампетэнцый курсантаў і студэнтаў юрыдычнага профілю: праграма курса непарыўна звязана з вывучэннем тэарэтычных асноў вядзення навукова-даследчай работы, а таксама авалоданнем галоўным інструментам навукі – навуковай мовай. Беларускамоўная камунікатыўная кампетэнцыя ў дадзеным выпадку мае ярка выражаную прафесійную скіраванасць (юрыдычную) і ставіць сваёй асноўнай мэтай развіццё ўменняў і навыкаў практычнага выкарыстання прававой лексікі ў сферы навуковых і прафесійных зносін. Таму вывучэнне дысцыпліны для будучых супрацоўнікаў органаў унутраных спраў і юрыстаў уваходзіць у працэс агульнай прафесіяналізацыі як адзінства ў вырашэнні дзвюх задач – авалоданне мовай спецыяльнасці і навыкамі яе практычнага выкарыстання праз навуковае пісьмо, навуковы пераклад, размову на прафесійныя (навуковыя) тэмы. Пры гэтым фарміруецца шэраг даследчых кампетэнцый, у прыватнасці: уменні працаваць з навуковай інфармацыяй, карыстацца навуковай літаратурай, ствараць навуковыя тэксты і прэзентаваць іх. Улічваючы гэтыя акалічнасці, выкладчыку неабходна дакладна вызначыць віды дзейнасці, метадычныя прыёмы і сродкі, якія будуць садзейнічаць фарміраванню даследчых кампетэнцый у межах аўдыторных заняткаў.

Вялікія магчымасці для авалодання навуковай мовай дае ўключаная ў вучэбную праграму курса тэма “Навуковы стыль маўлення”. Варта адзначыць, што навуковы стыль – гэта асноўны стыль выкладання дысцыплін у вышэйшай навучальнай установе, стыль усіх жанраў вучэбна-навуковых тэкстаў, якія даводзіцца ствараць курсантам і студэнтам у працэсе атрымання выбранай спецыяльнасці. Асноўная мэта навучання навуковаму стылю заключаецца ў фарміраванні навыкаў успрымання, разумення, ацэнкі вусных і пісьмовых тэкстаў, а таксама стварэння другасных і арыгінальных тэкстаў, што задавальняюць патрабаванням навуковасці. У сувязі з гэтым галоўным прадметам вывучэння на занятках з’яўляецца навуковы тэкст як крыніца інфармацыі. Праца з ім носіць інтэграваны характар: вядзецца аналіз моўных адзінак, узятых не ізалявана, а ў тэксце, у маўленчым патоку, а таксама робіцца спроба ўстанаўлення сувязі моўных сродкаў і іх функцыі. Разгорнуты аналіз навуковага тэксту выконваецца навучэнцамі па наступным плане: агульная характарыстыка тэксту на адпаведнасць навуковаму стылю (падстыль, чытацкі адрас, жанравая форма); прадметна-тэматычная характарыстыка тэксту (тэма, ідэя, праблематыка); адлюстраванне стылеўтваральных рыс у тэксце (з прывядзеннем прыкладаў); вызначэнне функцыянальна-

сэнсавага тыпу мовы; акрэсленне спосабаў аргументацыі і падачы матэрыялу ў тэксце; камунікатыўна-сэнсавы аналіз тэксту; дэманстраванне моўных асаблівасцей тэксту (на лексіка-семантычным, марфалагічным, сінтаксічным узроўнях). Пры падборы выкладчыкам тэкстаў улічваецца змястоўна-кагнітыўны аспект, звязаны з выкарыстаннем прафесійна-арыентаванага матэрыялу, дзе адлюстроўваецца змест спецыяльных (юрыдычных) дысцыплін, што будзе садзейнічаць засваенню паняційнага апарату, паглыбленню прафесійных ведаў навучэнцаў, павышэнню іх цікавасці да прафесіі.

Працэс стварэння навуковых тэкстаў патрабуе найперш адпрацоўку ўменняў і навыкаў выкарыстання моўнага матэрыялу. З гэтай мэтай можна прапанаваць практыкаванні такога тыпу: перакласці тэрміны на беларускую мову; утварыць абстрактныя назоўнікі, дзеепрыметнікі ад найбольш частотных для навуковай мовы дзеясловаў; замяніць сінонімамі сродкі сувязі ў тэксце, пабочныя канструкцыі; паставіць словазлучэнні ў правільнай форме; працягнуць сінанімічныя рады ўніверсальных канструкцый і інш.

Фарміраванне ўменняў і навыкаў падвяргаць тэкст аналітыка-сінтэтычнай перапрацоўцы з’яўляецца важнай умовай стварэння якаснага навуковага тэксту. Рэалізацыі гэтай задачы служаць наступныя заданні: вылучыць асноўныя структурныя кампаненты тэксту, скласці план; выканаць індэксаванне тэксту (выдзеліць апорныя тэрміны); сфармуляваць тэзісы тэксту, выкарыстаць прыёмы кампрэсіі; аформіць выдзелены фрагмент тэксту рознымі спосабамі цытавання; скласці анатацыю да тэксту (інфарматыўную або індыкатыўную); па прапанаванай схеме напісаць рэцэнзію да тэксту; скласці рэферат тэксту; падрыхтаваць аналітычны агляд літаратуры па тэме, аформіць яго бібліяграфічны спіс і інш.

Такі падыход да навучання культуры навуковай мовы дазваляе рэалізаваць камунікатыўны прынцып у методыцы выкладання, арганізаваць прафесійна арыентаванае навучанне, навучыць курсантаў і студэнтаў прымяняць тэарэтычныя і практычныя веды ў форме, адпаведнай сферы навуковых зносін.

На практычных занятках па тэме “Культура прафесійнага маўлення” ўводзіцца такая форма работы, як абарона рэфератаў і дакладаў, дзе навучэнцы атрымліваюць магчымасць прадставіць вынікі сваёй працы перад шырокай аўдыторыяй. У працэсе публічнага выступлення адпрацоўваюцца асноўныя прынцыпы аратарскага майстэрства: моўныя нормы, камунікатыўныя якасці і тэхніка маўлення, уменні прамоўцы трымацца на публіцы, імправізаваць, спалучаць слоўныя дзеянні з на-

глядным суправаджэннем (прэзентацыйным матэрыялам), карыстацца невербальнымі сродкамі, весці дыялог, дыскусію з прысутнымі.

Такім чынам, граматна арганізаваная метадычная работа па фарміраванні навукова-даследчых кампетэнцый служыць падрыхтоўчым этапам для правядзення навучэнцамі самастойных навуковых даследаванняў пад кіраўніцтвам выкладчыка, дае магчымасць развіваць у іх крытычнае мысленне, карыснае ў любой юрыдычнай прафесійнай дзейнасці (нарматворчай, правапрымяняльнай, праваахоўнай, навуковай і інш.).

УДК 378.225

***В.Н. Радоман****, начальник научно-педагогического факультета Академии МВД Республики Беларусь, кандидат юридических наук, доцент;*
***А.В. Кащеев****, ученый секретарь ученого совета Академии МВД Республики Беларусь, кандидат исторических наук*

## НАУЧНО-ОРИЕНТИРОВАННОЕ ОБРАЗОВАНИЕ: ПРОБЛЕМА СООТНОШЕНИЯ ОБРАЗОВАТЕЛЬНОГО И НАУЧНО-ИССЛЕДОВАТЕЛЬСКОГО КОМПОНЕНТА

В 2022 г. в Республике Беларусь вступила в действие новая редакция Кодекса Республики Беларусь об образовании. Одной из новаций данного кодекса стало «переименование» послевузовского образования в научно-ориентированное образование. Таким образом, особо подчеркивается его научная составляющая, однако, как представляется, не решается его содержательное противоречие. И проблема заключается в особенностях правового регулирования подготовки научных работников высшей квалификации. Так, в советское время подготовка научных работников высшей квалификации, в частности, в Основах законодательства Союза ССР и союзных республик о народном образовании от 1 января 1974 г. была выделена в отдельное направление деятельности учреждений высшего образования и научных организаций. В принятом 29 октября 1991 г. Законе Республики Беларусь «Об образовании» подготовка научных работников высшей квалификации была включена в структуру национальной системы образования. Последующие изменения в белорусском законодательстве испытали на себе влияние российского законодательства, а также Модельного закона «Об образовании», принятого 3 апреля 1999 г. на XIII пленарном заседании Межпарламентской Ассамблеи государств – участников СНГ. Последним вводилось такое понятие, как «послевузовское профессиональное образование», которое являлось одним из образовательных уровней. В результате в 2002 г.